**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Ігошына**

**Вольга Аляксандраўна**

# Новая лексіка на старонках сучаснага перыядычнага друку

**Дыпломнае даследаванне**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Навуковы кіраўнік –**

**кандыдат філалагічных навук,**

**дацэнт Лобань Н. П.**

**Мінск, 2013**

## РЭЗЮМЭ

Ігошына Вольга Аляксандраўна

# Новая лексіка на старонках сучаснага перыядычнага друку

**Ключавыя словы:** неалагізмы, лексічныя неалагізмы, семантычныя неалагізмы, намінатыўныя неалагізмы, стылістычныя неалагізмы, запазычанне, уласнабеларусізмы, калькаванне, жарганізацыя, абрэвіяцыя.

**Аб'ектам даследавання** дыпломнай работы з'яўляецца беларускі перыядычны друк.

**Прадмет даследавання** – новая лексіка беларускай мовы.

**Мэта** дыпломнай работы – даследаваць новы лексічны матэрыял, размешчаны на старонках газет "Звязда", "Літаратура і мастацтва", "Рэспубліка" за 2010 – 2013 гады, ахарактарызаваць яго тэматычныя і структурныя асаблівасці.

У дыпломнай рабоце разглядаецца новая лексіка, размешчаная на старонках газет "Звязда", "Рэспубліка", "Літаратура і мастацтва", праводзіцца яе размеркаванне па прадметна-тэматычных групах, вызначаюцца шляхі пашырэння слоўнікавага складу мовы, а таксама спосабы ўтварэння новых слоў.

**Актуальнасць даследавання.** Пастаянная актуальнасць неалагічнай праблематыкі абумоўлена самой спецыфікай аб'екта даследавання. Новыя словы паяўляюцца ў мове бесперапынна, яны могуць хутка ўвайсці ў актыўны лексічны запас або гэтак жа хутка ўстарэць, з'яўляючыся самым рухомым, ледзь улоўным пластом лексікі, які цяжка паддаецца фіксацыі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі і асноўныя палажэнні дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны пры далейшай распрацоўцы пытанняў, звязаных з вывучэннем новай лексікі беларускай мовы, а менавіта крыніц паходжання новых лексем, спосабаў утварэння новых слоў і інш. Матэрыялы даследавання знойдуць сваё прымяненне пры напісанні магістарскіх дысертацый, навуковых артыкулаў, пры стварэнні слоўнікаў новых слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ